***Чараўко В.У.*** *(г. Полацк)*

# КЕРАМІКА ЯК МАТЭРЫЯЛЬНАЕ СВЕДЧАННЕ ПАМІНАЛЬНАГА АБРАДУ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ РАСКОПАК МОГІЛЬНІКА КАЛЯ В. КЛЕШЧЫНО БЕШАНКОВІЦКАГА РАЁНА Ў 2013 г.)[1]

Познасярэдневяковы могільнік каля в. Клешчыно Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці быў выяўлены і апісаны ў 1995 г. кіраўніком этнаграфічна-археалагічнай экспедыцыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ПДУ), кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам У.А. Лобачам [10, с. 45, 48]. У 2013 г. археалагічнай экспедыцыяй ПДУ на могільніку праводзіліся раскопкі, падчас якіх было даследавана пяць пахаванняў. Антрапалагічную экспертызу касцяных парэштак праводзіла кандыдат біялагічных навук, дацэнт В.А. Емяльянчык.[2]

В.А. Емяльянчык было ўстаноўлена, што ў чатырох з пяці даследаваных пахаваннях прысутнічалі фрагменты шкілетаў дарослых і дзяцей [8, с. 28]. Парушэнне анатамічнага парадку костак у пахаванні 1, наяўнасць чатырох цвікоў двух варыянтаў ад труны (масіўных каваных і меншых, блізкіх да сучасных) і незвычайна вялікая колькасць цвікоў (31 адзінка) сведчылі аб падпахаванні памерлых дзяцей ва ўжо існуючыя магілы [13, с. 86–88]. У ходзе раскопак былі выяўлены шматлікія фрагменты сценак, донцаў і венцаў керамічнага начыння XVI–XX стст. – усяго 158 пазіцый [13, с. 88]. Шэсць фрагментаў керамікі было знойдзена ў пахаванні 1, астатнія – па-за магіламі: 10 фрагментаў – у пласце 1,92 – у пласце 2,50 – у пласце 3 (на глыбіні адпаведна да 0,2 м, 0,4 м і 0,6 м ад узроўню дзённай паверхні) [16, с. 38–45]. Размяшчэнне большай часткі фрагментаў керамічнага начыння па-за магіламі, нязначная глыбіня залягання сведчаць аб тым, што гэта не пахавальны, а памінальны інвентар.

Наяўнасць фрагментаў керамікі ў верхніх пластах культурнага слою адзначана на шэрагу пахавальных помнікаў Панямоння і Падзвіння (раскопкі А.В. Квяткоўскай), на познасярэдневяковых могільніках Новы Болецк Гарадоцкага раёна (раскопкі В.М. Ляўко), Туржэц 2 Полацкага раёна (раскопкі Д.У. Дука), Івесь і Доўгае Глыбоцкага раёна (раскопкі аўтара) і іншых [1, с. 136; 6, с. 262–263, 265; 9, с. 61; 14, с. 133; 15, с. 382]. Якім рэаліям пахавальна-памінальнай практыкі беларусаў Падзвіння адпавядаюць знойдзеныя фрагменты посуду?

---

[1] Работа выканана ў рамках навукова-даследчай работы «Фарміраванне антрапалагічнага складу і адаптыўнага статуса насельніцтва Полацкага Падзвіння ў XI–XIX стст.» у межах задання 1.1.02 «Сацыяльна-эканамічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў IX – пачатку XXI ст.: крыніцазнаўства, гістарыяграфія, антрапалогія і іншыя спецыяльныя даследаванні» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг.

[2] Аўтар выказвае падзяку В.А. Емяльянчык за праведзеную антрапалагічную экспертызу.

У вачах нашых продкаў смерць і пахаванне чалавека не прыводзілі да аўтаматычнага выключэння яго з жыцця калектыву. Пераход памерлага ў статус «дзядоў» вымагаў часу і патрабаваў ажыццяўлення пэўных рытуальных дзеянняў, значная частка якіх адбывалася на могілках [11, с. 414]. На наступны пасля пахавання дзень адбываліся «траціны»: родныя паміналі памерлага на могілках, пакідаючы там частку рытуальных страў і посуд [3, с. 32–33; 11, с. 414]. Важнае значэнне меў абрад «прыкладзінаў», які выконваўся на працягу года пасля пахавання, уключаў упарадкаванне магілы і памінкі на могілках. Упарадкаванне магілы магло прымяркоўвацца да асенніх Дзядоў ці Радаўніцы [2, с. 148–149, 152; 11, с. 415–416]. Прыкладзіны завяршалі цыкл індывідуальнай памінальнай абраднасці і азначалі пераход памерлага ў катэгорыю «дзядоў» [2, с. 152; 3, с. 34; 11, с. 415–416].

Пахавальна-памінальныя абрады павінны былі не толькі дапамагчы нябожчыку трапіць у іншы свет, але і паспрыяць паступоваму выдаленню памерлага з сацыяльнай структуры і памяці людзей [5, с. 24–25]. Таму цыкл індывідуальнай пахавальнай абраднасці звычайна працягваўся прыкладна год. Пасля гэтага памерлы шанаваўся ў межах агульных памінальных дзён разам з іншымі дзядамі [3, с. 31]. Пры гэтым на Дзяды і Радаўніцу было прынята пакідаць на могілках частку рытуальных страў [4, с. 394; 7, с. 150]. Посуд, які бралі на памінкі, пакідалі на могілках, там жа часам разбівалі гаршкі з прынесеным вуголлем [7, с. 150; 12, с. 94].

Шматлікасць фрагментаў керамікі, выяўленых у пластах 1–3 у межах шурфа на могільніку каля в. Клешчыно (152 фрагменты на плошчы 21 м$^2$), указвае на шматразовае выкананне памінальных абрадаў. Інтэнсіўнасць рытуальных дзеянняў можа быць патлумачана дзіцячымі падпахаваннямі, пры якіх ужо існуючыя пахавальныя помнікі актуалізаваліся ў вачах мясцовага насельніцтва, вымагаючы выканання індывідуальных памінальных абрадаў.

Такім чынам, у выніку археалагічных даследаванняў на могільніку каля в. Клешчыно Бешанковіцкага раёна ў 2013 г. было даследавана пяць пахаванняў, чатыры з якіх утрымлівалі дзіцячыя падпахаванні. У шурфе было знойдзена 156 фрагментаў керамікі XVI–XX стст., 152 з якіх выяўлена ў верхніх пластах культурнага слою могільніка. Падобная з’ява назіраецца ў шэрагу іншых познасярэдневяковых могільнікаў беларускага Падзвіння. Наяўнасць фрагментаў посуду абумоўлена памінальнымі абрадамі беларусаў. Значная колькасць фрагментаў керамікі на невялікай плошчы ўказвае на працяглась і інтэнсіўнасць рытуальных дзеянняў, што тлумачыцца дзіцячымі падпахаваннямі ў існуючыя магілы. Вынікам гэтага было ажыццяўленне новых абрадаў індывідуальнага памінальнага цыкла.

ЛІТАРАТУРА

1. **Археалогія** Беларусі : у 4 т. / [рэдкал.: М. В. Біч (стар.) і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 4 : Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. – 597 с.

2. **Аўсейчык, У. Я.** Абрад «прыкладзіны» ў беларусаў Падзвіння / У. Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. II Міжнар. навук. канф. (да 20-годдз. археалагічных і этнаграфічных экспедыцый ПДУ), Полацк, 17–18 крас. 2014 г. : у 2 ч. – Наваполацк, 2014. – Ч. 1. – С. 144–156.

3. **Аўсейчык, У. Я.** «Прыватная» (індывідуальная) памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння (па матэрыялах канца XX – пачатку XXI стагоддзяў) / У. Я. Аўсейчык // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2015. – № 9. – С. 31–37.

4. **Васілевіч, У.** Радаўніца / У. Васілевіч, Л. Дучыц, С. Санько // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд.: Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск, 2011. – С. 394–395.

5. **Грунтов, С.** Проблеми та перспективи етнологічного дослідження меморіальних пам’ятників Білорусі XIX – початку XXI століття / С. Грунтов // Народна творчість та етнографія. – 2009. – № 6. – С. 24–26.

6. **Дук, Д. У.** Археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2008. – № 15. – С. 261–269.

7. **Дучыц, Л.** Дзяды / Л. Дучыц, І. Швед // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд.: Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 150.

8. **Емяльянчык, В. А.** Вынікі антрапалагічнай экспертызы матэрыялаў пахаванняў з могільнікаў каля вв. Жарнасекава і Клешчыно Бешанковіцкага раёна, в. Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці / В. А. Емяльянчык // Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. – Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага Навуковага архіва НАН Беларусі. – Спр. № 3153. – С. 27–28.

9. **Квятковская, А. В.** Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVII вв.). / А. В. Квятковская. – Вільнюс : Diemedžio, 1998. – 327 с.

10. **Лобач, У.** Да вынікаў археалагічна-этнаграфічнай экспедыцыі ў мястэчку Бачэйкава і яго ваколіцах / У. Лобач // Матэрыялы II Міжнароднай канферэнцыі па праблемах музеефікацыі ўнікальных гістарычных тэрыторый. – Полацк, 1996. – С. 45–48.

11. **Лобач, У. А.** Міф. Прастора. Чалавек : традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 510 с.

12. **Традыцыйная** сямейная абраднасць беларусаў: гісторыка-культуралагічны аспект : вучэб.-метад. комплекс / склад. і агул. рэд. В. І. Мішынай. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 220 с.

13. **Чараўко, В. У.** Археалагічнае вывучэнне грунтовых пахаванняў XVI–XVIII стагоддзяў на могільніку каля в. Клешчыно Бешанковіцкага раёна ў 2013 годзе / В. У. Чараўко // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2015. – № 9. – С. 84–89.

14. **Чараўко, В. У.** Археалагічныя разведкі на грунтовым могільніку каля в. Доўгае Глыбоцкага раёна ў 2010 г. / В. У. Чараўко // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. прац Міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 крас. 2011 г. : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – С. 130–134.

15. **Чараўко, В. У.** Археалагічныя разведкі на грунтовым могільніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна ў 2010 годзе / В. У. Чараўко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2012. – Вып. 23. – С. 379–383.

16. **Чараўко, В. У.** Справаздача аб археалагічных раскопках на могільніках каля в. Жарнасекава Бешанковіцкага р-на, в. Івесь Глыбоцкага р-на і археалагічных разведках на тэрыторыі Бешанковіцкага і Полацкага раёнаў Віцебскай вобласці ў 2013 годзе / В. У. Чараўко // Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. – Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага Навуковага архіва НАН Беларусі. – Спр. № 3153.

# ВІЦЕБСКІ КРАЙ



*Да 385-годдзя выдання "Буквара"*
*Спірыдона Собаля*

**2**

ВІЦЕБСКІ КРАЙ

2

ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ
І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА
«ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА»

УСТАНОВА КУЛЬТУРЫ «ВІЦЕБСКІ АБЛАСНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ»

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ П.М. МАШЭРАВА»

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

# ВІЦЕБСКІ КРАЙ

Т. 2

*Матэрыялы II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля*

24 лістапада 2016 г., Віцебск

Мінск 2017

УДК 947 (Р476.5)
ББК 63.3 (4 Беи-Вит)5
В54

Рэцэнзенты:
дэкан гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»,
доктар гістарычных навук, прафесар В. А. Космач,

загадчык аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі дзяржаўнай навуковай
установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,
кандыдат гістарычных навук А. Б. Доўнар,

загадчык кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. М. Дулаў

Рэдакцыйная калегія:
Т. М. Адамян (гал. рэд.), В. М. Камендантава, Л. І. Рагачова,
В. М. Аўсяннікава, А. М. Васілеўская, Н. В. Фенчанка

*На вокладцы – царква Аршанскага Куцеінскага манастыра
Магілёўскай губерні*

**Віцебскі** край : матэрыялы ІІ Міжнароднай навукова-практычнай
В54 канферэнцыі, прысвечанай 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля, 24 лістапада 2016 г., Віцебск / Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Установа культуры «Віцебскі абласны краязнаўчы музей», Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», Кафедра гісторыі Беларусі ; [рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2017. – Т. 2. – 336 с.
ISBN 978-985-7125-21-0

У т. 2 штогадовага выдання «Віцебскі край» увайшлі матэрыялы ІІ Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля, якая адбылася 24 лістапада 2016 г. у ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна».

Выданне адрасавана гісторыкам, музейным супрацоўнікам, архівістам, краязнаўцам, бібліятэкарам, педагогам, усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

**УДК 947 (Р476.5)**
**ББК 63.3 (4 Беи-Вит)5**

**ISBN 978-985-7125-21-0**

© Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2017
© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», 2017

## ЗМЕСТ

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

## ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

*Агееў А.Р.* Дзейнасць Спірыдона Собаля ў кантэксце беларуска-ўкраінскіх школьных сувязей канца XVI – XVII ст. . . . . . . . . 4
*Анисяев М.А.* Организация борьбы с дезертирством на Западном фронте в 1919–1920 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
*Арлова А.Г.* Адлюстраванне гістарычнага і культурнага мінулага в. Бачэйкава ў мастацкім фільме «Джэнтэльмен і певень» (1928 г.) . . . . . 13
*Базарэвіч Г.Х.* Культурна-адукацыйныя і забаўляльныя мерапрыемствы Віцебска як крыніца даходаў для галадаючых Паволжа ў 1921–1923 гг.. . . . . . . . 17
*Бараноўскі А.В.* Матруна Маркевіч – аўтар узору, узятага за аснову арнаменту на дзяржаўным сцягу Беларусі . . . . . . . . 21
*Барановский А.Л.* Железнодорожное строительство в военном городке Боровка Лепельского района: неизвестные страницы истории . . 23
*Белюков Д.А.* Из истории краеведения: И.М. Пульхеров – священник, просветитель, краевед . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
*Валаханович И.А.* Организация и деятельность Витебской областной оперативно-чекистской группы НКВД . . . . . . . . 32
*Иванова Т.П.* Роль исторического краеведения в гражданско-патриотическом воспитании и развитии исторического образования школьников . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
*Каплиев А.А.* Истоки формирования службы скорой медицинской помощи в городе Витебске в первой четверти XX столетия . . . . . . . . . 43
*Кобринец В.А.* К вопросу об источниках поступления русских монет на территорию Беларуси . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
*Корсак О.В.* Краеведческое направление деятельности Витебского губернского статистического комитета (60–80-е гг. XIX в.) . . 52
*Косов А.П.* Международные связи Витебщины в 2000-е гг. в контексте развития интеграционных процессов . . . . . . . . . . . . . 55
*Коц А.Л.* Да пытання аб забудове Полацкага Запалоцкага пасада ў XI–XII стст. (па матэрыялах археалагічных раскопак 2012–2013 і 2015–2016 гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
*Краско Г.Г.* Деятельность органов НКГБ – МГБ среди репатриантов . 66
*Кулинок С.В.* Разоблачение партизанами Витебщины немецкой агентуры в годы Великой Отечественной войны . . . . . . . . . . . . . . 70
*Марціновіч С.В.* З гісторыі кінафікацыі Віцебскага і Суражскага раёнаў у 1920–1930-я гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74

*Марціновіч С.В., Ліпава Г.В.* З гісторыі калгаса імя Ланцуцкага і в. Агароднікі Віцебскага раёна . . . . . . . . . . . . . . . .79
*Махиня О.В.* Краеведение как средство патриотического воспитания студенческой молодежи . . . . . . . . . . . . . . . . . . .83
*Нікіціна Л.К.* Школьная адукацыя ў Заронаўскім краі ў XIX – першай палове XX ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .87
*Огородников А.А.* Мероприятия советской власти в отношении памятников истории и культуры в 1917–1941 гг. (на примере Полоцка) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .92
*Петренко А.В.* Изменение организационной структуры армий Западного фронта в 1915–1917 гг. на примере 10-й армии . . . . . . . . . .96
*Пятрэнка Н.А.* Сем узгоркаў Віцебска. . . . . . . . . . . . . . . . . .98
*Стрyнченко А.А.* О жизни и деятельности Якова Петровича Кульнева (по материалам журнала «Русская старина»). . . . . . . . . . . 103
*Титова Н.И.* Люди с улицы Подвинской . . . . . . . . . . . . . . . 105
*Трусова Е.Г.* Михаил Николаевич Гнилорыбов: судьба в русской революции . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
*Хмельницкая Л.В.* Внучка Томаша Зана – «крупнейшее явление среди всех людей пера, пишущих об Инфлянтах» . . . . . . . . 115
*Чараўко В.У.* Кераміка як матэрыяльнае сведчанне памінальнага абраду (па матэрыялах раскопак могільніка каля в. Клешчыно Бешанковіцкага раёна ў 2013 г.) . . . . . . . . . . . . 120
*Шишанов В.А.* К библиографии публикаций Карла Гюбенталя и о нем . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
*Юрчак Д.В.* Восстановление разрушенных культовых объектов Витебска: история и перспективы . . . . . . . . . . 138
*Яшчанка А.Р.* Гандаль кнігамі і канцтаварамі ў гарадах БССР у першыя пасляваенныя гады. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147

## ЛІТАРАТУРНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА І МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА

*Аляксеева Т.У.* Фальклор у драматургіі Фёдара Палачаніна . . . . . . 150
*Бароўка В.Ю.* Падзвінне ў мастацкіх творах В. Ластоўскага: аксіялагічны ракурс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154
*Генкин В.М.* Ойконимия Витебщины как источник сведений по истории региона . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
*Горохова В.Ю.* Жанр сказки в польском фольклоре . . . . . . . . . . 163
*Лещинский М.А.* Александр Сергеевич Пушкин и Александр Иванович Казарский . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
*Лісаў А.Г.* Віцебскі «Маладняк» у зборніку «Пачатак» (да 90-годдзя першага беларускага літаратурнага альманаха ў Віцебску) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 173

*Мясаедава С.М.* «Яўрэйскі Даль» Залман Храпкоўскі . . . . . . . . . . 179
*Падстаўленка В.Ф.* Аповесць «Голы звер» Міхася Зарэцкага як унікальны жанравы прыклад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 184
*Півавар К.С.* Роля краязнаўства ў дзейнасці студэнцкага лінгвістычнага гуртка Віцебска . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
*Пушкина О.И.* Контаминация образа русалки в мифологии восточных славян. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 191
*Саматой І.В.* Жанрава-стылёвы аспект прозы Сяргея Рублеўскага . 196
*Свецік В.Л.* Сістэма маральна-этычных каштоўнасцей у жыцці і творчасці Максіма Танка. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 199
*Синкевич Т.И.* Названия озер – культурно-историческое наследие наших предков. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203
*Слесарева Т.П.* Эпитет-колоратив *красный* в песенных текстах Витебского Поозерья: семантический аспект . . . . . . . . . . 206

## КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫЯ ЎСТАНОВЫ Ў СІСТЭМЕ СУЧАСНАГА КРАЯЗНАЎСТВА

*Дедюлина Л.Б.* Биобиблиографический указатель «Исследователи Полотчины XVI – начала XXI в.» как один из источников сохранения исторической информации о Полоцке . . . . 210
*Ермалёнак В.А.* Старыя беларускія выданні ў музеі кнігі і друку ДУА «Міёрская сярэдняя школа № 3 імя Героя Савецкага Саюза Ягора Андрэевіча Томкі» . . . . . . . . . . . . . . . 213
*Карновіч М.А.* Бібліятэчнае краязнаўства як фактар захавання нацыянальнай культуры і гісторыі . . . . . . . . . . . . . 218
*Корникова Н.В.* Посещение памятников историко-культурного и природного наследия в регионах Беларуси интеллигенцией в начале XXI в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 222
*Кузьмина А.С.* «Берестейские книгосборы» как пример регионального краеведческого проекта . . . . . . . . . . . 227
*Ладожина Т.Н., Царегородцева М.Л.* Персоналии смоленско-витебского приграничья: по материалам печатных источников Смоленщины . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . *232*
*Лапотка К.А.* Праектная дзейнасць як сродак захавання і папулярызацыі кніжнай спадчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 238
*Півавар М.В.* Феномен Куржалава: месца і роля асобы ў развіцці краязнаўства Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240
*Подлипский А.М.* Краеведческий клуб Витебской областной библиотеки им. В.И. Ленина . . . . . . . . . . . . . . . . . . 246
*Шнер Н.О.* Краеведческий алфавит . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 251

## РЭЛІГІЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

*Буле М.В.* Лудзенская Большая синагога:
история, реставрация, развитие, перспективы . . . . . . . . . . . . . . . . . 256
*Василицына Л.А.* Устные источники в церковном краеведении:
история монастыря по воспоминаниям старожилов . . . . . . . . . . . . 261
*Верамееў С.Ф.* Язафат Кунцэвіч: партрэт на фоне эпохі . . . . . . . . 265
*Гавриленков А.Ф.* «Смоленские епархиальные ведомости»
как источник по истории конфессий в Смоленской губернии
в 1865–1918 гг.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 269
*Карпекін К.Р.* Іўдзейская абшчына Оршы ў сярэдзіне
1940-х – 1970-я гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 274
*Лаўрык Ю.М.* Да пытання пра крыніцы
Скарынавага перакладу Бібліі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 278
*Макараў М.Д.* Новая крыніца па гісторыі
Васкрасенскай Рынкавай царквы ў Віцебску . . . . . . . . . . . . . . . . 283
*Мыслівец Г.М.* Станаўленне агульнацаркоўнага культу
Еўфрасінні Полацкай (1910–1917) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 288
*Шевкун П.В.* Коммуникативный аспект ликвидации
Брестской унии на территории Полоцкой православной
епархии (1833–1840 гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 294
*Юркевич Г.А.* Кутеинская Лавра – духовно-просветительский
центр в XVII в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 300

Дадаткі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 305
Звесткі пра аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 329